# БЕРАСЦЕЙСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна

ВЫДАВЕЦ: УА «БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.С. ПУШКІНА»
**Выдаецца з 1997 года**

**№ 8 (116)**
Выходзіць 2 разы ў месяц
31 сакавіка 2009 года


## Сёння ў нумары:


а **Размова аб набалелым**
24 сакавіка ў канферэнц-зале універсітэта адбылася сустрэча рэктарата са старастамі акадэмічных груп
стар. 2

а **Як нараджаюцца зоркі**
На прэм’еру спектакля «Блажь» народнай тэатральнай студыі універсітэта сабралася шмат народу
стар. 3

а **Квінта–2009**
Пра гала-канцэрт вакальнага конкурсу чытайце на
стар. 4

а **Кто на свете всех милей?**
Это попыталась выяснить В. Черник на конкурсе «Самая обаятельная и привлекательная»
стр. 6

а **У нас на факультэце**
Як бавяць час студэнты розных факультэтаў, калі заканчваюцца вучэбныя заняткі? Чытайце аб гэтым у нашай рубрыцы на
стар. 7

а **Літаратурны дэбют**
стар. 8


# Удзячная памяць



Рэктар М.Э. Часноўскі ўручае дыплом А. Рамановіч

***На Савеце універсітэта 25 сакавіка падведзены вынікі універсітэцкага і абласнога тураў V Рэспубліканскага конкурсу творчых прац «Вялікая Айчынная вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа», прысвечанага 65-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.***

***У другім туры конкурсу прынялі ўдзел студэнты ўсіх вышэйшых і навучэнцы сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі Брэсцкай вобласці. Усяго на конкурс прадстаўлена 15 работ.***

***Сярод тых, чые працы накіраваны на рэспубліканскі тур, і нашы студэнты: А. Рамановіч, Р. Заляшчук (гістарычны факультэт) і Л. Буката (філалагічны факультэт).***

***Віншуем!***

## НАШЫ НАВІНЫ

*25 сакавіка адбыўся Савет універсітэта, на якім дэкан фізічнага факультэта У.А. Плецюхоў расказаў аб стане і перспектывах развіцця факультэта.*

• • •

*19–20 сакавіка на базе універсітэта прайшла міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Лінгвакультурная адукацыя ў сістэме вузаўскай падрыхтоўкі спецыяліста». Гэта другая па ліку канферэнцыя наназваную тэму (першая адбылася ў мінулым годзе), арганізаваная кафедрай замежных моў і кафедрай замежных моў з методыкай выкладання. Арганізатары выказваюць задавальненне ад мерапрыемства, і гэта не дзіўна: у канферэнцыі прынялі ўдзел шмат гасцей – відных вучоных Расіі, Украіны, Польшчы, Балгарыі. Не абмінулі ўвагай гэтую падзею і айчынныя навукоўцы. Важна падкрэсліць, што ў Брэст завітала генеральны дырэктар НДЦ «Еўрашкола» (г. Масква) В.В. Сафонава, якая вельмі высока ацаніла ўзровень навукова-практычнай канферэнцыі, яе шырокае праблемнае поле. Сапраўды, лінгвакультурную адукацыю за два дні разгледзелі з розных бакоў: з пазіцый філасофіі, педагогікі, псіхалогіі, лінгвістыкі, літаратуразнаўства, методыкі выкладання замежнай мовы.*

*У межах канферэнцыі прайшоў таксама аўтарскі семінар «Выкарыстанне тэхналогій вучэння ў супрацоўніцтве на занятках па англійскай мове» І.М. Андрэасян, прафесара МГЛУ (г. Мінск).*

• • •

*25 сакавіка на фізічным факультэце адбылася інфармацыйная гадзіна, прысвечаная аперацыі «Баграціён». Арганізатар – старшы выкладчык кафедры інфармацыйных тэхналогій Л.І. Капіца. Студэнты (асноўны дакладчык А. Картамышава, ІІІ курс) расказвалі пра асноўныя моманты і этапы вызвалення нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, апавядалі пра некаторых непасрэдных удзельнікаў аперацыі «Баграціён», падкрэслівалі яе значнасць не толькі для айчыннай гісторыі, але і наогул другой сусветнай вайны. Падчас лекцыі дэманстраваліся фотаздымкі таго часу, якія дапамагалі стварыць больш выразную карціну ваеннай эпохі.*

# Студэнцкая вясна-2009

**19 сакавіка ў ЦМТ адбылося ўрачыстае адкрыццё фестывалю студэнцкай творчасці «Студэнцкая вясна–2009». У гэты вечар прайшоў трэці тур універсітэцкай лігі КВЗ. Лідэрам па-ранейшаму застаецца каманда гістарычнага факультэта, з чым мы яе і віншуем.**


Каманда філалагічнага факультэта са сваім джынам (у цэнтры)

**У межах фестывалю прайшоў шэраг самых розных мерапрыемстваў: сустрэчы, конкурсы, выставы, канцэрты, пасяджэнні, інтэлектуальныя гульні і іншае. Многія артыкулы дадзенага і наступнага нумароў прысвечаны менавіта гэтаму буму студэнцкай актыўнасці. Ніжэй прыведзены матэрыял аб адным з першых мерапрыемстваў фестывалю.**

**ЁСЦЬ КАНТАКТ**

# Размова аб набалелым

**24 сакавіка ў канферэнц-зале універсітэта адбылася сустрэча рэктарата са старастамі акадэмічных груп.**

Такія сустрэчы праводзяцца штогод. На іх абмяркоўваюцца найбольш актуальныя праблемы, што хвалююць розумы студэнтаў.

Сэнсавым і накіроўваючым стрыжнем такіх сустрэч служаць загадзя падрыхтаваныя пытанні, да адказаў на якія рэктарат можа падрыхтавацца і, адпаведна, даць вычарпальныя каментарыі.

Як і ў мінулыя гады, большасць пытанняў закранала эканамічны складнік жыцця універсітэта: з 50 пытанняў 70% адносіліся менавіта да гэтай тэмы. Не аднойчы прагучала пытанне аб павышэнні памера стыпендыі. Як адзначыў Мечыслаў Эдвардавіч, ужо падпісаны загад аб індэксацыі стыпендый і заработнай платы на 5,4%, і сакавіцкая стыпендыя будзе дапоўнена пераразлікам за люты.

Аднак назваць гэта павышэннем можна толькі з нацяжкай. Справа ў тым, што індэксацыя праводзіцца з мэтай кампенсацыі інфляцыйнага або дэвальвацыйнага абясцэньвання грошай.

Затурбочанасць студэнтаў выклікае частае павышэнне платы за навучанне. Па словах рэктара, у структуры затрат сродкаў, што паступаюць ад студэнтаў-платнікаў, не менш 70% складаюць затраты на заработную плату выкладчыкам, супрацоўнікам, а астатнія 30% – на іншыя патрэбы: камунальныя плацяжы, набыццё абсталявання, рамонт памяшканняў і іншае. А рост заработнай платы, камунальных плацяжоў і т.п. абумоўлівае і павелічэнне платы за навучанне.

Мне здаецца, каб умацаваць давер між студэнтамі і адміністрацыяй універсітэта, можна было б укараніць сістэму справаздач пра накірункі і колькасць затрачаных сродкаў, хоць бы у адносінах да сум платы за навучанне платнікамі. Форма справаздачы – напрыклад, вывешаны на стэндзе ліст фармата А2 з пералікам артыкулаў затрат і канкрэтнымі сумамі па гэтых артыкулах. Як вынік – і студэнты бачаць структуру расходаў, і да кіраўніцтва універсітэта менш прэтэнзій наконт выкарыстання фінансавых сродкаў.

*А. Сідаровіч*
*(геграфічны факультэт)*

АСОБА



# З юбілеем!

**Надыход вясны ўжо сам па сабе ўяўляе свята, а на фізічным факультэце сёлета ён супадае яшчэ з адной святочнай датай – 80-гадовым юбілеем дацэнта кафедры методыкі выкладання фізікі і агульнатэхнічных дысцыплін Аляксандра Міхайлавіча Ківакі.**

Аляксандр Міхайлавіч нарадзіўся 1 красавіка 1929 года ў в. Мерніца Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Пасля заканчэння ў 1952 г. фізічнага факультэта Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага працаваў настаўнікам фізікі, а затым дырэктарам у сельскіх сярэдніх школах Брэсцкай і Мінскай абласцей. З 1962 па 1965 гг. вучыўся ў аспірантуры на кафедры фізікі Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, а пасля завяршэння вучобы пачаў працаваць у Брэсцкім педагагічным інстытуце імя А.С. Пушкіна, дзе адразу быў прызначаны на пасаду старшага выкладчыка кафедры агульнай фізікі.

У 1974 г. А.М. Півака паспяхова абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук і тады ж стаў загадчыкам створанай кафедры методыкі выкладання фізікі і ТСН, якой кіраваў на працягу 10 гадоў. Пад яго кіраўніцтвам быў сфарміраваны калектыў выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры, створаны лабараторыі ў новым корпусе, наладжана эфектыўнае навучанне студэнтаў метадычным дысцыплінам. Дзякуючы яму на кафедры пастаянна падтрымлівалася здаровая маральна-псіхалагічная атмасфера.

Пасля выхаду на пенсію Аляксандр Міхайлавіч Півака не пакінуў універсітэт, а застаўся працаваць на пасадзе дацэнта кафедры методыкі выкладання фізікі і агульнатэхнічных дысцыплін. За 43 гады працы ў Брэсцкім універсітэце Аляксандр Міхайлавіч праявіў сябе як высокаадукаваны і выключна добрасумленны і адказны выкладчык; за гэты час ім выхавана не адно пакаленне будучых настаўнікаў фізікі, і зараз, нягледзячы на свой узрост, ён працягвае заставацца адным з вядучых выкладчыкаў кафедры.

Значны ўклад зрабіў А.М. Півака ў павышэнне кваліфікацыі настаўнікаў Брэсцкай вобласці, для якіх рэгулярна чытаў лекцыі па методыцы выкладання фізікі ў абласным інстытуце павышэння кваліфікацыі работнікаў адукацыі.

А.М. Півака працягвае актыўна займацца навукова-метадычнай працай. Яго артыкулы друкуюць рэспубліканскія часопісы «Народная асвета» і «Фізіка: праблемы выкладання»; усяго ён мае звыш 60 публікацый па праблемах выкладання фізікі.

За добрасумленную працу на ніве адукацыі А.М. Півака ўзнагароджаны знакам «Выдатнік народнай адукацыі» і медалём «За працоўную доблесць».

Здароўя Вам, Аляксандр Міхайлавіч, шчасця і новых навуковых здзяйсненняў!

*Вашы калегі*

У ГАСЦЯХ У МЕЛЬПАМЕНЫ

# Як нараджаюцца зоркі

**На прэм'еру спектакля «Блажь» народнай тэатральнай студыі БрДУ імя А.С. Пушкіна, што адбылася 20 сакавіка ў актавай зале вучэбнага корпуса № 2, сабралася шмат народу. Настолькі шмат, што многім нават давялося стаяць. Хоць незадаволеных, як мне падалося, не было. П'еса двух аўтараў: А.М. Астроўскага і П.М. Нявежына – вартая такой ахвяры.**

Поўны аншлаг спектакля яшчэ раз падкрэслівае, што класіка заўсёды ў павазе. Тым больш калі твор мае тэматыку і праблематыку, што ніколі не згубяць актуальнасць. А «Блажь», якая не карысталася папулярнасцю ў савецкі час, бо лічылася безыдэйнай, якраз да такіх твораў і адносіцца.

*(Працяг на старонцы 4)*



## У ГАСЦЯХ У МЕЛЬПАМЕНЫ

# Як нараджаюцца зоркі

*(Пачатак на старонцы 3)*

У цэнтры – драма (хоць п'еса па вызначэнні камедыйная) немаладой збяднелай дваранкі Серафімы Давыдаўны Сарытавай (Р. Панасюк), якая растранжырыла сваю маёмасць і маёмасць малодшых сясцёр, жадаючы купіць каханне маладога хлопца. Абраннік Сарытавай – яе ж упраўляючы Сцяпан Рыгоравіч Баркалаў (А. Чарэйчык) – скарыстоўвае глыбокую прывязанасць гаспадыні і ўмела спускае яе грошы. Даходзіць да таго, што Серафіма ледзьве не страчвае любоў сваіх родных: сясцёр Насці і Вольгі (В. Чэрнікава, І. Пруднікава – на фота адпаведна злева і справа) і цёткі (І. Люфт). Толькі мудрасць і кемлівасць Вольгі, якая баіцца за рэпутацыю сям'і і пры гэтым імкнецца выцягнуць старэйшую сястру з бездані, вяртае ідылію ў дом Сарытавых.

Як вядома, аднаго толькі цікавага сюжэту мала для таго, каб спектакль адбыўся ў поўным сэнсе гэтага слова. Не менш значнымі складнікамі тэатральнага поспеху з'яўляюцца пастаноўка, дэкарацыі, музычнае афармленне і, безумоўна, праца акцёрскага саставу. Пра апошняе хочацца сказаць асобна.

Гульня ўсіх выканаўцаў была настолькі пераканаўчай, настолькі майстэрскай, што я як глядач пасля двух хвілін спектаклю зусім забылася, што перада мной не прафесіяналы, а толькі аматары, хоць само гэтае някрыўднае слова можа гучаць лёгкай абразай для нашых артыстаў.

Хочацца падкрэсліць майстэрства пераўвасаблення І. Люфт – цёткі сясцёр, на адрас якой у зале чулася шмат зычлівых рэплік; В. Чэрнікавай, жывой і эмацыйнай Насці, што так нечакана ў канцы камедыі сабралася замуж за мясцовага прайдоху; А. Чарэйчыка, таксама надзвычай сімпатычнага ў вобразе лавеласа. З эпізадычных роляў адразу згадваецца багацей Лізгуноў, якога таленавіта зыграў С. Іванюк, хоць астатніх акцёраў таксама не хочацца пакрыўдзіць.

Нам застаецца толькі пажадаць далейшых поспехаў народнаму тэатру і новых, не менш значных, прэм'ер!

*І. Хоміч*

## КОНКУРС

# КВІНТА-2009

**Песня. Яна суправаджае па жыцці кожную асобу. Мы звяртаемся да добрага музычнага твора, калі нам сумна і калі весела, калі хочацца пабыць адзін на адзін з думкамі і, наадварот, калі адзінота страшэнна надакучвае. Гэта не парадокс – гэта закон жанру.**

Можа, таму песеннае мастацтва такое папулярнае ва універсітэце. Пацвярджэнне таму – гала-канцэрт вакальнага конкурсу «Квінта–2009».

На суд гледачоў і строгага журы на чале з прарэктарам па вучэбнай частцы Ст.Р. Рачэўскім паўсталі выканаўцы розных факультэтаў. Найбольш масава былі прадстаўлены псіхолага-педагагічны (не дзіўна, улічваючы, што на гэтым факультэце песенным мастацтвам займаюцца на прафесійным узроўні) і геаграфічны факультэты. Дарэчы, прадстаўнікі менавіта гэтых куточкаў універсітэта і «разабралі» ўсе прызавыя месцы.

Фінал конкурсу склалі 14 нумароў, сярод якіх як сольныя (большасць) нумары, так і дуэты, і нават трыо. Выступалі выканаўцы, канешне, неаднародна, аднак гледачам усё роўна цяжка было адгадаць, хто ж стане фаварытам конкурсу, бо такі шанс быў у многіх.

Падзялюся з чытачом ўражаннямі дылетанта, спыніўшыся на тых канкурсантах, насупраць прозвішча каго падчас выступлення мне захацелася паставіць клічнік у сваім нататніку.

Ю. Аліферук. Цудоўны выбар рэпертуару. Па тэхніцы выканання, па пранікнёнасці і нават па жэстыкуляцыі прадстаўніца юрыдычнага факультэта вельмі нагадала нарвежскую ўдзельніцу «Еўрабачання», песню якой і пазычыла канкурсантка. Юля здолела стварыць непаўторны, надзіва цэласны і, што таксама важна, запамінальны вобраз.

К. Задарожная (псіхолага-педагагічны факультэт). Шкада, што не аб'яўлялі другую дзяўчыну, што падпявала Каці. Я б назвала гэты нумар дуэтам: так хораша выглядалі дзяўчаты разам. Безумоўна, відаць рука прафесіянала, што працавала з гэтым тандэмам. Вельмі прыгожа, вельмі напеўна, у лепшых традыцыях народнай калыханкі і ў той жа час не без наватарства ў тэксце і манеры выканання.

*(Працяг на старонцы 8)*



НА СВАЕ ВОЧЫ

# Кто на свете всех милей?

**24 марта в рамках «Студенческой весны» в актовом зале учебного корпуса № 2 прошёл межфакультетский конкурс красоты «Мисс–2009». Посмотреть на лучших девушек нашего университета пришли студенты и преподаватели практически со всех факультетов.**

Инициатором праздника стал биологический факультет, за что ему огромное спасибо. Ребята потрясающе украсили сцену и зал, расстелили красную дорожку – всё как на настоящем подиуме.

Ведущие объявили первый выход – «Вечерний стиль» – и кратко рассказали об участницах во время дефиле. В конкурсе участвовали: Н. Юнчик и Е. Лазько (социально-педагогический факультет), Ю. Рупека (исторический), Н. Шурхай (филологический) и М. Салюк (биологический). Надо сказать, девушки сразу произвели яркое впечатление. Каждый образ запомнился неповторимостью, целостностью и, конечно, красотой.



Ещё три дефиле предстояло показать нашим «золушкам»: в спортивном, деловом стилях и фантазию «На волнах мечты». Девушки были яркими и оригинальными во всём. Зрители запомнили и боксёрские перчатки Е. Лазько, и скромную шахматистку М. Салюк, и все деловые наряды, хотя они и совпали в цветовой гамме.

Для фантазийного дефиле девушкам необходимо было создать свой неповторимый образ. Все девчонки проявили себя творчески: абсолютно реалистичными были и Barbie – Наташа Шурхай, и Клеопатра – Юля Рупека, и Маша Салюк в роли первобытной женщины. И зрители, и члены жюри были в восторге.

Помимо дефиле участницы продемонстрировали на сцене свои таланты. Девушки танцевали, рассказывали стихи, а представительница биофака призналась, что любит готовить, и презентовала жюри торт собственного приготовления.

В этот день девчонок пришли поддержать их друзья, своими выступлениями старавшиеся охарактеризовать участниц. Просто зажгли зал парни с народными инструментами – группа поддержки Н. Шурхай. Многие даже подпевали: «Эх, Наташа! Живи и процветай!».

Немаловажным испытанием для красавиц был конкурс «Не всё то золото, что блестит», где они должны были продемонстрировать свои умственные и интеллектуальные способности. В первой части конкурса «Мудрые мысли» девушки высказывались на предложенные темы, а во второй – «Интеллектуальная викторина» – стойко отвечали на каверзные вопросы жюри. Участницы отметили, что вопросы отличались по уровню сложности. Например, все знают, что у человека четыре конечности, и далеко не все – из какого бокала по правилам этикета нужно пить белое вино. Тем не менее девушки прекрасно справились и с этим заданием, поражая своим обаянием и самообладанием.

Итак, беспристрастное жюри удалилось на совещание. Зрители первыми вынесли свой вердикт: приз зрительских симпатий получила Ю. Рупека. Всем девушкам присвоили номинации и подарили цветы и подарки, а звание «Самой обаятельной и привлекательной» жюри единогласно присудило М. Салюк (обладательнице звания «Вице-мисс–2008» биологического факультета – на фото). Мария была приятно удивлена и призналась, что никак не ожидала такого исхода.

Вечер закончился, но остался в памяти всех присутствовавших. Студенты и преподаватели от души поблагодарили участниц, организаторов конкурса. Все надеются, что конкурс станет традиционным в нашем университете.

*В. Черник*
*(филологический факультет)*

# Ох уж эти студенты!

**Чего только не придумают юные дарования, чтобы обеспечить себе захватывающую, насыщенную, а главное, лёгкую учёбу! С некоторыми потрясающими разработками и новинками учебного и чисто «молодёжного» прогресса удалось познакомиться на психолого-педагогическом факультете. Там 25 марта прошла выставка атрибутики студенческой жизни.**

Выставка, конечно, не совсем форматная, зато шумная, весёлая, со множеством развлекательных конкурсов и подарков. В качестве экспонатов были представлены не только конспекты, шпаргалки, студенческие билеты и журналы, но и некоторые примеры провизии, предметы, наполняющие косметички молоденьких студенток, военный билет, а также живые манекены (на фото). Центральное место на выставке по праву получил бутерброд «Особый».

Приятно, что выставку посетили не только студенты, но и преподаватели, которым, думаю, тайная завеса студенческих хитростей всё же была приоткрыта!

*А. Локтикова*
*(психолого-педагогический факультет)*



## СТУДЭНЦКІЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ

# НАШ САЙТ

**Наши студенты в очередной раз подтвердили, что способны не только приобретать знания и умения, но и реализовывать их на практике. Доказательством тому служит не так давно размещённый в интернете сайт математического факультета http://brsubrest-net.na.by.**

Инициатива его создания принадлежит В. Ходину и В. Лагвиновичу (математический факультет, III курс).

На сайте можно найти интересующую студентов матфака литературу, посмотреть фотографии, отражающие жизнь факультета, принять участие в голосовании. Для этого существует форум, где студенты также могут обменяться мнениями по тому или иному вопросу. Сайт очень динамичен: каждый день обновляется. Причём меняется не только содержание, но и оформление, что делает посещение намного интереснее.

Администраторы утверждают, что подобные информационные ресурсы должны быть на каждом факультете. Оно и правильно: с высоким темпом развития информационных технологий преобладающее количество студентов черпает информацию именно из интернета.

Мы также взяли у В. Ходина и В. Лагвиновича небольшое интервью.

*– Как к вам пришла идея создать сайт факультета?*

– На нашем факультете преподают много специальных дисциплин, одна из которых – веб-программирование. Вот мы и подумали: почему бы не реализовать наши знания, сделать действительно что-то стоящее?

*– Что нового планируется на сайте в ближайшее время?*

– Мы собираемся расширить галерею, создать маленькую электронную библиотеку. Кстати, каждый посетитель может оставить свои пожелания в специальном опроснике, чтобы мы видели, что ещё нужно сделать для улучшения нашего электронного ресурса.

*Э. Герман*
*(математический факультет)*



## НАВІНЫ СПОРТУ

***26–27 сакавіка ў спартыўным комплексе універсітэта прайшоў чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па плаванні сярод каманд МНС. У арганізацыі і судзействе спаборніцтваў прынялі непасрэдны ўдзел студэнты факультэта фізічнага выхавання.***

• • •

***25 сакавіка праводзілася адкрытае першынство універсітэта па армрэслінгу з удзелам зборнай каманды БрДТУ.***

***Спаборніцтвы праходзілі ў фае спартыўнага комплексу. У іх прынялі ўдзел больш за 35 спартсменаў, 20 з якіх – студэнты нашай alma mater. Пераможцаў у гэты дзень было шмат, што і не дзіўна: узнагароды размяркоўваліся па шасці вагавых катэгорыях. У агульнакамандным заліку перамогу атрымала каманда факультэта фізічнага выхавання. Другое месца за геаграфічным факультэтам і трэцяе – за юрыдычным.***

***Віншуем пераможцаў!***

*А. Кухарчык*

## У НАС НА ФАКУЛЬТЭЦЕ

# Рыцарский турнир

**На физическом факультете ни один праздник не остаётся незамеченным. И вот, объединив февральские и мартовские поводы для веселья, профбюро физического факультета организовало рыцарский турнир, участниками которого стали и мужская, и женская половины факультета.**

Почётными приглашёнными вечера – они же и члены жюри – стали Т.А. Шуйская, замдекана по воспитательной работе, А.В. Демидчик, преподаватель кафедры общей физики, С.М. Минич, куратор группы ФИ–11.

Конкурсная программа была разнообразной. Ребята проверялись и на смекалку, и на внимательность, и на умение сочинять стихи. Жюри с удовольствием оценило конкурс, где студенты проявили свои театральные способности. Юноши физического факультета, как оказалось, умеют очень вкусно готовить, а девушки – сопереживать и быть, как говорится, всегда рядом.

И хотя все пары показали себя достойно, победителем стала лишь одна, буквально вырвавшая победу у других, – К. Ковалевич и В. Шпаковская. Все участники получили памятные призы, любезно предоставленные профкомом студентов.

В целом рыцарский турнир удался: наши парни доказали, что достойны носить звание рыцарей, а девушки проявили все качества настоящей дамы сердца.

*А. Картамышева*
*(физический факультет)*



У НАС НА ФАКУЛЬТЭЦЕ

# В наших традициях

**Юридический факультет, хоть и является самым молодым, а уже успел обрасти своими устоями и обычаями. Поэтому, по уже сложившейся хорошей традиции, День факультета (конец февраля) был отмечен сразу несколькими яркими и интересными мероприятиями.**

Специально для юного поколения юристов был организован неординарный поединок под названием «Большие гонки», в котором студенты должны были продемонстрировать не только выносливость, но ещё и умение ориентироваться, решать на ходу сложные задания и работать в команде. Игра прошла в несколько этапов-станций, и, по принципу интеллектуальной эстафеты, подсказку, где будет следующая станция, участники получали только на станции предыдущей. На протяжении всей игры первокурсникам приходилось проявлять смекалку и хитрость, знание различных дисциплин и, конечно же, хорошие спринтерские качества. Старый корпус, факультет иностранных языков, спорткомплекс, магазин «Сатурн» – кажется, первокурсники успели побывать везде. Команда, ставшая в тот день победителем, была щедро вознаграждена за свои выносливость и сообразительность – на финише её ожидали сладкие призы.

Но эстафета стала далеко не единственным состязанием, посвящённым Дню рождения факультета. В преддверии праздника была проведена ещё и интеллектуальная игра, участниками которой стали «лучшие умы» нашего факультета. Конкурс состоял из 3 туров, в каждом из которых было по 10 вопросов. А состязались в интеллектуальном турнире студенты практически всех специальностей юридического факультета.

Турнир проходил в невероятно весёлом ритме, ведь даже в самых сложных ситуациях никто не сдавался без боя, руководствуясь девизом «Может быть, и неправильно, зато смешно». Победой для каждой, без исключения, команды стало отличное настроение на весь день и множество весёлых воспоминаний. А самая эрудированная по итогам игры команда получила памятные призы, предоставленные профсоюзным комитетом студентов.

Третьим интересным событием стал турнир по боулингу, в котором приняли участие сборные команды каждого курса. Было совсем неважно, новичок ты или уже давно тяготеешь к этой невероятно захватывающей игре,– главным стало участие. Командный конкурс подарил участникам множество приятных эмоций.

Надеюсь, что следующие поколения студентов подхватят наши традиции и из года в год этот праздник будет наполняться ещё более яркими красками!

*Т. Кисляк*
*(юридический факультет)*

# Как это было

**Первые учебные недели очередного семестра оказались богатыми на череду праздников.**

Не успел геофак отойти от двухнедельных каникул, как тотчас же был настигнут Днём всех влюблённых. Пожалуй, географы ждали его наступления с не меньшим замиранием сердца, чем прихода Нового года: готовили подарки, верили в чудо и в то, что покровитель всех влюбленных – святой Валентин – в этот день поможет им в исполнении самых заветных желаний. А для того чтобы эти самые желания имели реальную почву для своего свершения, Советом самоуправления факультета была организована дискотека с конкурсами, азартность которых многократно усиливалась участием приглашённых соседей снизу – биологов. В одном из конкурсов географам надо было выразить свои высокие чувства партнёру из пары биологическими терминами, а биологам – географическими, что не могло никого оставить равнодушным. Звучали эпитеты: «Моя майская роза», «Как я люблю целовать твой «глобусик!»... И до сих пор теряюсь в догадках, что имел в виду один из конкурсантов, обращаясь к своей даме: «Как мне нравятся твои полюса!..»

Несомненно, одной из примечательнейших дат февральской поры является День защитников Отечества. Говорят, что этот праздник есть не что иное, как подготовка к 8 Марта. Что ж, может быть, и так! Наверное, он возник вследствие нежелания сильной половины мириться с вопиющим фактом несправедливости существования Международного женского дня и полного отсутствия аналогичного мужского.

Сильной половине геофака была предоставлена превосходная возможность блеснуть если уж не армейской выправкой, то мощью своих бицепсов–трицепсов (на фото). Ну и с учётом того, что нынче решать конфликты и споры предпочтительно дипломатичными методами, тренировка ума и развитие сообразительности в игре «Что? Где? Когда?» оказалась как нельзя кстати.

Думаю, многие согласятся, если я скажу, что начало весны ассоциируется с Международным Женским (рука не поднимается написать с маленькой буквы) днём.

Студентами факультета для преподавателей университета, которые работают на географическом факультете, был устроен праздничный концерт, на котором своими вокальными способностями блистали И. Кульбеда, О. Аминева, Е. Лисицина, Ю. Гусева, М. Грицай, А. Грисюк и М. Смаглюк. С поздравлениями к нам на праздник пришли учащиеся гимназии № 1 г. Бреста.

И в честь замечательного праздника была организована дискотека в Доме культуры с романтическим названием «Кирпич». Так пусть если кирпичи и падают, то не на нас...

*А. Сидорович,*
*(географический факультет)*



## ДЭБЮТ

*Меня зовут Татьяна Ткачик. Я родилась в Алма-Ате в 1990 г. Через 2 года моя семья переехала на Беларусь, в живописную деревню Броды на Пружанщине. Там я окончила 9 классов, а продолжила учёбу в СШ № 4 г. Пружаны, которая дала мне основательную подготовку для поступления на факультет иностранных языков. Сейчас я учусь на 2-м курсе. Несмотря на то что каждая минута расписана, я всегда найду время, чтобы пригласить в гости вдохновение...*

### Где-то...

*Где-то вдали волны бьются с дождём*
*За право быть с ветром рядом.*
*Где-то философы спорят о том,*
*Как лучше читать шифры взгляда.*
*Где-то безумная дробь сердец*
*Несёт в себе отзвуки лета,*
*Где-то святыми руками Творец*
*Мир создаёт в лучах света.*
*Где-то цветёт Вечный Сад зимой,*
*Тихо дремлет в нём нежность прохлады.*
*Где-то кому-то придёт порой*
*То письмо, что послужит отрадой.*

*Где-то в бесконечности звёзд*
*Млечный Путь бороздят караваны.*
*Где-то пройдёт над рекой шаткий мост,*
*Заставляя менять наши планы…*
*Где-то встречаются, плачут и ждут...*
*Любовь предают, уходя без оглядки.*
*Где-то клянутся быть верным и лгут,*
*Говоря, что у них всё в порядке...*
*Где-то и ты под осенней звездой*
*Мечтаешь о чём-то высоком...*
*Где-то во снах я случайно с тобой*
*Плыву по морям глубоким...*
*Где-то живёшь ты, далёкий мираж,*
*Придуманный мной в день ненастья.*
*Где-то один ты – не мой персонаж –*
*Пытаешься выследить счастье…*

• • •

### Её счастье…

*Её сердце, как лёд, как осколок металла,*
*Гранённый снаружи и мягкий внутри.*
*О счастье своём никогда не мечтала,*
*Но встретилась с ним на широком пути.*
*Весь мир изменился, он будто очнулся.*
*В глазах отразились небес купола.*
*Обыденный день в колыбели качнулся,*
*И голосом тихим запела луна.*
*И с счастьем своим по лесным тротуарам*
*Она, словно ветер, неслась по волнам.*
*А вечером с пылкою страстью пожара*
*Дарила второе дыханье огням.*
*И солнце с небес ей тепло улыбалось,*
*Её отраженьем гордилась луна.*
*А счастье второй половинкой назвалось*
*И бродит теперь с ней везде и всегда.*

## КВІНТА-2009

(Пачатак на старонцы 4)
Не магу не падкрэсліць, што «Калыханка» – адзіная беларускамоўная песня на конкурсе. А дарэмна, удзельнікі, ігнаруеце выйгрышную мелодыку роднай мовы!

Ю. Гусева (геаграфічны факультэт). Згодна з журы, што спецыяльна для гэтай выканаўцы ўвяло намінацыю «Адкрыццё конкурсу». Аб узроўні яе выступлення гаворыць ужо той факт, што Станіслаў Рыгоравіч напрыканцы пацікавіўся ў Юлі, ці не вучылася яна спевам. Аднак канкурсантка прызналася, што гэта толькі яе хобі.

Вердыкт журы агучыў пасля музычнага перапынку старшыня, даўшы папярэдне лапідарную ацэнку кожнага выступлення, абгрунтоўваючы тым самым рашэнне суддзяў.

Прыз сімпатый гледачоў атрымала студэнтка факультэта замежных моў В. Ярмолік. Дыплом III ступені атрымалі прадстаўніцы геафака – В. Амінева і І. Кульбеда, дыплом II ступені – у К. Задарожнай і дыплом I ступені апынуўся ў руках салістак трыо «Шакалад» (кіраўнік – Л.І. Борсук).

Эстэтычнае задавальненне – мабыць, гэты выраз я б прыняла ў якасці спантаннай вербальнай рэфлексіі на ўбачанае. Тыя, хто не быў на конкурсе, мабыць, не зразумелі, пра што я пісала. Але гэта стымул вам быць больш актыўнымі ў наведванні такіх мерапрыемстваў.

І. Хоміч

## НА ШТО МЫ ЗДАТНЫЯ

**Падведзены вынікі выставы-кірмаша кулінарных вырабаў «Шлях да сэрца студэнта», які адбыўся 23 сакавіка. Большасць удзельнікаў падышлі да справы сур'ёзна і адказна, праявіўшы не толькі кулінарныя, але і крэатыўныя здольнасці, што і знайшло адбітак у наступных намінацыях.**

Філалагічны факультэт – «Антыкрызісное меню», факультэт замежных моў – «Нясціпла, але са смакам», факультэт фізічнага выхавання – «Рынак побач», юрыдычны – «Уся праўда аб прафесіі» (на фота відаць адна з салодкіх страў юрфака – шакаладныя наручнікі), гістарычны – «Сувязь часоў», біялагічны – «Сакрэтныя матэрыялы», фізічны – «Энергія мозга» і матэматычны факультэт – «Геаметрыя смаку».



«Берасцейскі ўніверсітэт» № 8 (116)
**Рэдакцыя:** рэдактар – І.А. Хоміч (тэл. 23–01–29).
Фота – У.С. Хрыстафораў. Кансультант – Л.А. Гадуйка.
Газета падрыхтавана на настольнай выдавецкай сістэме РВА БрДУ імя А.С. Пушкіна,
224665, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21.
Надрукавана на рызографе УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна».
224016, г. Брэст, вул. Міцкевіча, 28.
E-mail: gazeta_brsu@brsu.brest.by.
Падпісана ў друк 31.03.2009.
Аб'ём 1 ум. друк. арк. Тыраж 250 экз.
Заказ № 129.
Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест матэрыялаў.

***Газета запрашае да супрацоўніцтва студэнтаў, выкладчыкаў і спецыялістаў універсітэта***